# ПРАБЛЕМА ХРАНАЛАГІЧНАЙ СТРАТЫФІКАЦЫІ XVI СТ. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ З ПОЛАЦКАГА ПАДЗВІННЯ)

***М. В. Клімаў***

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, г. Мінск, Беларусь*

Калі звярнуцца да публікацый айчынных даследчыкаў, у якіх утрымліваюцца матэрыялы XVI ст., то складаецца ўражанне, што XVI ст. добра прадатавана. Але неабходна прызнаць, што такое бачанне выглядае даволі павярхнёвым, бо ў большасці публікацый магчыма сустрэць згадку пра датаванне ў межах XV–XVI стст., XVI ст., без якой-небудзь дакладнай храналагічнай стратыфікацыі, якая дазваляе вылучыць мікраперыяды. Напрыклад, ці можам мы казаць аб тым, што па матэрыяльнай культуры першая палова XVI ст. адрозніваецца ад другой паловы XVI ст.? Ці магчыма ў межах XVI ст. вылучыць першую, другую або трэцюю чвэрць стагоддзя? Ранейшыя публікацыі, у якіх змяшчаліся матэрыялы, датаваныя ў тым ліку і XVI ст., па-сутнасці, гэтага зрабіць не дазвалялі па некалькіх прычынах.

Па-першае, амаль не публікаваліся асобна комплексы ям, а толькі абагульненні па матэрыяльнай культуры па катэгорыях матэрыялаў, накшталт, вырабы з жалеза ці керамічныя вырабы. Нават пры публікацыі ям, за некаторымі выключэннямі, матэрыялы падаваліся сукупна. Для горада, такога, да прыкладу, як Полацк, публікацыя матэрыялаў ускладнялася наяўнасцю ў межах комплексаў рэчаў шырокага храналагічнага дыяпазона, што вынікала з характара гаспадарчай дзейнасці ў межах горада [1, с. 43, 57, 92].

Па-другое, прывязка матэрыялаў менавіта, да XVI ст. насіла выразна суб’ектыўны характар, бо у межах гарадоў ці паселішчаў даследчыкі не мелі магчымасці абаперціся на добра датаваныя комплексы. А пры амаль поўнай адсутнасці ілюстратыўных крыніц і малой долі пісьмовых, якія б характарызавалі матэрыяльнаю культуру беларускіх зямель у XVI ст., прыходзілася спасылацца на заходнееўрапейскія аналагі ў ідэнтыфікацыі рэчавага матэрыяла ці карыстацца наўгародскай шкалой храналогіі. Малую «ілюстратыўнасць» XVI ст. дэманструюць і некаторыя выданні, прысвечаныя гісторыі матэрыяльнай культуры больш шырокага перыяду. Напрыклад, у манаграфіі, якая распавядае аб побыце феадалаў Вялікага Княства Літоўскага XV – сярэдзіны XVII ст. для паказу адзення ў якасці асноўнай айчыннай ілюстратыўнай крыніцы выступае «Радзівілаўскі летапіс» і выявы асобных археалагічных артэфактаў, напрыклад, абутку, без дакладнай храналагічнай прывязкі [2, с. 168–173, 175–179, 182–183].

Зададзімся іншым пытаннем. Якія артэфакты дакладна маркіруюць пласт XVI ст.? Пры адказе на ўказанае пытанне ўсе артэфакты неабходна храналагічна вылучыць у чатыры групы. Першую групу (надалей, I група) складалі артэфакты, бытаванне якіх адбывалася ў XV ст. і мела працяг у XVI ст. Другую групу (надалей, II група) складаюць артэфакты, якія з’явіліся менавіта ў XVI ст., і перыяд іх бытавання не выходзіць за межы дадзенага храналагічнага адрэзка. Трэцяя група артэфактаў (надалей, III група) складаецца з шэрагу тых, якія з’яўляюцца ў культурным пласце і бытуюць у XVI ст., але яны характэрны і для пласта XVII ст. Чацвёртая група артэфактаў (надалей, IV група) – артэфакты ўніверсальнага гаспадарчага ўжывання без дакладна акрэсленых храналагічных рамак, якія амаль не змяняліся ў XV, XVI, XVII стст.[1] Звернемся да характарыстыкі ўказаных вышэй груп з асноўным акцэнтам на матэрыялах, выяўленых аўтарам падчас даследавання Полац-

[1] XV ст. і XVII ст. прыведзены ў прапанаваным разглядзе як храналагічна сумежныя XVI ст., і ў некаторых выпадках указаныя артэфакты групы I пачыналі бытаванне ў XIV ст. або раней па часе і працягвалі бытаваць без змен і ў XVIII ст. ці пазней, але разгляд дадзеных аспектаў не з’яўляецца мэтай прадстаўленага артыкула.

кага Падзвіння, якое акрэсліваецца як цэнтральная частка Беларускага Падзвіння, змешчаная паміж Віцебскім Падзвіннем і Браслаўскім Паазер'ем.

**I група.** Першую групу складалі артэфакты, бытаванне якіх адбывалася ў XV ст. і мела працяг у XVI ст., але храналогія бытавання указаных прадметаў не выходзіла за XVI ст. Такіх прадметаў няшмат, таму ўкажам на самыя вядомыя з іх шэрагу.

Сярод вырабаў з каляровых металаў назавём адметную фурнітуру некалькіх **тыпаў торбаў**, якія датаваліся канцом XV – першай паловай XVI ст. па матэрыялах Наўгародскай зямлі і характарызаваліся разнастайным наборам накладак [3, с. 42–45]. Да падобнай торбы дакладна адносіліся дзве накладкі (Мал. 1: А), выяўленыя ў межах помніка Лучна–1. Аналагічныя знаходкі вядомы сярод пад'ёмных матэрыялаў з тэрыторыі Полацка [4, с. 141, № 244; с. 151, № 265].

Пераходны перыяд ад XV да XVI ст. маркіруюць і замкі тыпу «Е», якія прыйшлі на змену замкам тыпу «Д» у XV ст. Заўважана, што храналагічная схема бытавання замкоў тыпу «Е» выкладзеная па наўгародскіх матэрыялах яшчэ ў 1959 г., цалкам адпавядае сітуацыі на Полаччыне і праявілася ў тым, што ў замках тыпу «Е», працягвалася выкарыстанне ключа тыпу «Д» [5, с. 87]. Даказана па матэрыялах з помніка Лучна–1 (комплекс ямы № 332-VII), што спалучэнне такіх элементаў як замок тыпу «Е» з ключом тыпу «Д» бытуе да сярэдзіны XVI ст. Таму просты разгляд ключоў тыпу «Д» у пласце у якасці адзнакі менавіта XV ст., на нашу думку, выглядае не зусім аб'ектыўным.

Керамічныя матэрыялы таксама маюць пэўны пераходны перыяд. Вельмі складана вылучыць тыпы гаршкоў, перыяд бытавання якіх акрэсліваецца другой паловай XV – пачаткам XVI ст., або канцом XV ст. – сярэдзінай, або другой паловай XVI ст. Няма публікацый адносна запаўнення ям, дакладнасць датавання якіх вызначаецца ў межах аднаго – пяці гадоў для мяжы XV–XVI стст.

Безумоўна, што храналогію мяжы XV–XVI стст. павінны былі маркіраваць манеты, але ў гэтым пытанні прасочваюцца пэўныя складанасці. Па матэрыялах Лучна–1, па-за межамі закрытых комплексаў XV ст., характэрна наяўнасць такіх манет, як дэнарыі (пенязі) Вітаўта, дэнарый Казіміра і пражскія грошы. Апошнія з іх ліку, аднесеныя да чаканкі Вацлава IV (апошні год чаканкі – 1378 г.), паходзілі і з запаўнення ям. Менавіта манеты Вацлава IV характарызуюць 2-гі перыяд абарачэння пражскіх грошаў у ВКЛ, які акрэсліваецца ў межах 1378–1492 гг. Нягледзячы на больш раннюю чаканку ў адносінах да дэнарыяў Вітаўта і Казіміра, бытаванне пражскіх грошаў не спынялася ў XV ст., а пераходзіла ў XVI ст. і нават у XVII ст., што пацвярджаецца знаходкамі ўказаных манет у скарбах, закапаных на тэрыторыі Беларусі і згадкай іх у пазнейшых дакументах [6, с. 412–414; 7, с 198]. У Лучна–1 пражскія грошы, выяўленыя ў запаўненні ям, маркіравалі перыяд да 1518 г., што не супярэчыць вышэй выкладзеным матэрыялам[2].

Іншы прыклад з Лучна–1, які сведчыць аб адноснасці даціроўкі па манетах «мяжы XV–XVI ст.» дэманструюць дэнарыі і паўгрошы Аляксандра Ягелончыка, якія чаканіліся на мяжы стагоддзяў (1492–1506 гг.). У межах даследаванай плошчы на помніку самыя позні па храналогіі комплексы ям, што вызначалася па сукупнасці матэрыялаў, мелі ў запаўненні паўгрошы Аляксандра Ягелончыка, а ў скарбе манет, захаванне якога адносіцца да 1551 г. (1552 г.), на тэрыторыі былой феадальнай сядзібы (III) Лучна–1 пасля яе знікнення 28 % манет (62 адзінкі) належылі да чаканкі Яна Ольбрахта (чаканка 1492–1501 гг.) і Аляксандра Ягелончыка [8, с. 158]. Прыведзены прыклад сведчыць аб тым, што храналагічная мяжа XV–XVI стст. не можа пацвярджацца выключна манетамі адпаведнай чаканкі, а значыць і керамічны посуд ў прадстаўленых ямах таксама можа датавацца ў больш шырокіх храналагічных межах, чым пачатак бытавання манет. Таму на помніку Лучна–1 для размежавання комплексаў канца XV ст. – 1551 (1552) г. выкарыстоўвася ком-

[2] У храналогіі існавання феадальных сядзіб на тэрыторыі Лучна–1 ў межах першай паловы XVI ст. вылучаецца тры фазы: А (да 1518 г.); Б (да 1535 г.); В (да 1551–1552гг.).

плексны аналіз, які ўлічваў тры вялікія перабудовы сядзібы ва ўказаны прамежак часу і аднатыпнасць некаторых артэфактаў, выяўленых у запаўненні розных ям. Напрыклад, у запаўненні ям апошняй фазы жыццядзейнасці (не пазней 1551 (1552) г.) цалкам адсутнічаюць фрагменты плітак з зялёнай палівай, якую не магчыма дакладна датаваць, аднак, яна ёсць у іншых ямах, звязаных з ранейшай перабудовай, такім чынам, пліткі выступалі ў якасці адноснага храналагічнага маркёра. Тое ж адбываецца з некаторымі відамі цэглы. Напрыклад, фрагменты цэглы некалькіх фарматаў прысутнічаюць у запаўненні адных ям і зусім не прысутнічаюць у запаўненні іншых ям. Так, вялікапамерная цэгла (таўшчыня 7–8 см) уласціва толькі для ям, блізкіх па храналогіі да 1551 (1552) г. Складанасць дакладнай храналагічнай прывязкі цэглы для перыяда канца XV – першай паловы XVI ст. пралягае ў адсутнасці дакладна датаваных пабудоў указанага перыяда ў Полацку або Віцебску. Напрыклад, пры даследаванні пабудовы, датаванай першай паловай XVI ст., у Полацку цэгла сярод матэрыялаў адсутнічала, былі выяўлены толькі керамічныя пліткі вакол печы [9, с. 91].




*Мал. 1.* Асобныя артэфакты групы I і II з помніка Лучна–1

А – накладкі на торбу; Б – замок тыпу «Е» і ключ тыпу «Д»; В – некаторыя тыпы венцаў гаршкоў з комплекса ямы № 7-I; Г – некаторыя тыпы венцаў гаршкоў з комплекса ямы № 332-VII; Д – некаторыя фрагменты гаршковай кафлі.

Але калі асобныя фарматы цэглы параўнаць з венцамі гаршкоў у запаўненні некаторых ям, выяўляюцца пэўныя заканамернасці, якія праяўляюцца ў наяўнасці ці адсутнасці акрэсленых тыпаў венцаў у ямах розных храналагічных падперыядаў. Такі падыход дазволіў вызначыць венцы, да якіх магчыма ўжыць «плавуючую» храналагічную мяжу, абазначаную як другая палова XV – пачатак XVI ст., напрыклад, з комплекса ямы № 7-І (мал. 1: В), і абазначыць эвалюцыю венцаў у межах першай паловы XVI ст., на чым мы спынімся ніжэй.

Да першай групы артэфактаў адносіцца і гаршковая кафля[3], бо бытаванне яе не перапынялася ў XV ст., што пацвярджаецца матэрыяламі з Заслаўя і Клецка [10, с. 324]. На помніку Лучна–1 былі выяўлены 3 падтыпы гаршковай кафлі, якія магчыма было датаваць у межах першай паловы XVI ст., і рэшткі дзвюх кафляных печаў па храналогіі блізкіх да сярэдзіны XVI ст. [11]. Матэрыялы з Лучна–1 дазволілі паказаць, што не існавала прамой эвалюцыйнай лініі развіцця гаршковай кафлі, пры якой адбывалася значнае памяншэнні вышыні кафлі (з 21–26 да 12–15см), за час з XIV да XV стст., як гэта лічылі некаторыя даследчыкі [12]. Гаршковая кафля з круглым вусцем, якая ў Лучна–1 па храналогіі блізкая да сярэдзіны XVI ст. мела румпы вышынёй да 20,5–21 см (Мал. 1: Д, 2). Разам з тым, было зафіксавана больш ранняе выпадзенне ў пласт гаршковай кафлі з квадрыфалійным вусцем (Мал. 1: Д, 1), што не супярэчыць агульнай храналогіі яе бытавання на шэрагу помнікаў Беларусі напрацягу XV ст. [13, с. 54].

**II група.** Артэфакты гэтай групы сустракаюцца толькі ў межах XVI ст. Сярод вырабаў з чорнага метала нельга вылучыць прадметы, характэрныя, менавіта, выключна для XVI ст. Храналогія вырабаў з каляровых металаў, якія таксама лакальна фіксуюцца толькі ў межах XVI ст., застаецца таксама не распрацаванай.

Калі пакінуць па-за ўвагай манеты, якія ва ўсялякім разе заўсёды будуць указваць на ніжнюю храналагічную мяжу (аб чым разважанні прыведзены вышэй), застаюцца толькі некаторыя тыпы гаршкоў, якія з'яўляюцца і існуюць у XVI ст. (Мал. 1: В). Такія тыпы па матэрыялах Лучна–1 мелі некалькі прыкмет, сярод якіх адзначым наступныя: істотны нахіл венца ўнутр аб'ёму начыння з наяўнасцю дакладна выражанага рабра, якое аддзяляе шыйку ад плячука, у некаторых выпадках з гарызантальна размешчаным плячуком пры пераходзе ад шыйкі. Ю. А. Зайцам па матэрыялах з Заслаўя было адзначана з'яўленне дадзенага тыпу з першай паловы ці сярэдзіны XVI ст. [14, с. 76, мал. 55: 1-III-В]. У класіфікацыйных табліцах гаршкоў з Полацка, прапанаваных Д. У. Дукам, такія гаршкі храналагічна не лакалізуюцца, менавіта, толькі для XVI ст. і датуюцца па аналогіях у шырокім храналагічным прамежку XV–XVI стст. ці XVI–XVII стст. [15, с. 102–110, мал. 30, 31, 32]. Безумоўна, што неабходна прызнаць важнасць ва ўказанні даследчыка адносна працэнту посуду, выраблenага на ручным ці нажным ганчарным коле пры храналагічным размежаванні керамікі першай і другой паловы XVI ст. [9, с. 91; 15, с. 101]. Аднак дакладна датаваны пласт у Полацку з'яўляецца праблемай. У іншых беларускіх гарадах толькі пры супастаўленні даных археалогіі і пісьмовых крыніц часам удаецца дасягнуць дакладнай храналогіі пласта, а значыць і керамічнага посуду ў ім. У гэтым сэнсе адносна XVI ст. паказальны прыклад Крычава, у якім ўдалося датаваць кераміку паміж 1535 г. і 1564 г. [16, с. 68, мал. 51]. У іншым выпадку, напрыклад, пры разглядзе гаршкоў паўночна-усходняй Беларусі першая палова XVI ст. у прадстаўленай класіфікацыі асобна не вылучалася [17, с. 32, таб. 2: група 1, Г, Д]. Адносна керамічных гаршкоў існуе і яшчэ адна праблема – умоўная мяжа паміж паняццем «другая палова» і «канец» XVI ст. не зусім вызначана. Якім чынам іх размежаваць па археалагічных матэрыялах?[4]

---

[3] У артыкуле адмыслова пакідаецца па-за ўвагай праблема храналогіі каробкавай кафлі, бо гэта пытанне вельмі складанае і патрабуе асобнага разгляду, да чаго звяртаўся шэраг даследчыкаў у ранейшых публікацыях.

[4] Зноў не акцэнтуем ўвагу на манетах з датай чаканкі ў межах XVI ст., бо гэта пытанне разглядалася вышэй.

**III група.** Артэфакты III групы з'яўляюцца ў культурным пласце і бытуюць у XVI ст., але характэрны і для пласта XVII ст. ці пазней.

Адным з красамоўных прыкладаў артэфактаў указанай групы з'яўлялася ваконнае шкло. Ваконнае шкло ўвозілася на тэрыторыю Беларусі і да XVI ст., аднак, з гэтага часу яно паступова шырока распаўсюджваецца ў гарадскім асяродку і ў феадальных сядзібах за межамі горада. Так, у Лучна – 1 фрагменты ваконнага шкла выяўлены, у асноўным, каля ямаў, ці ў ямах, звязаных з існаваннем жытлаў, якія будаваліся і існавалі ў 20-40-я гг. XVI ст. Тут фіксацыя выкарыстання шкляных вакон пацвярджаецца і знаходкамі свінцовых ваконных пераплётаў. У Полацку ваконнае шкло таксама выяўлена ў адной з пабудоў, якая датуецца першай паловай XVI ст. [15, с. 180].

Сярод жалезных вырабаў, якія з'явіліся менавіта на тэрыторыі Беларусі ў XVI ст. і ўвайшлі ў шырокі ўжытак не раней за гэты час, адзначым відэльцы [10, с. 269]. Іх згадка ў дакументах XVI ст. адносна зямель ВКЛ носіць «сціплы» характар. Так, у адным з маёнткаў у 1583 г. пералічваецца 37 лыжак, 24 нажы і толькі 6 відэльцаў [2, с. 153]. Таму і не павінна здзіўляць тое, што на помніках Полацкага Падзвіння адсутнічаюць добра датаваныя ямы XVI ст., у якіх назіраецца выпадзенне відэльцаў, што дазваляе нам казаць аб іх яшчэ малой распаўсюджанасці. Так, у культурным пласце Лучна–1, датаваным першай паловай XVI ст., назіраецца іх поўная адсутнасць, іншымі словамі, нават у межах феадальнай сядзібы ў азначаны перыяд відэльцы не ўвайшлі ў шырокі побыт. У пласце XVII–XVIII стст. відэльцы ўжо фіксуюцца, што падкрэслівае сітуацыя з культурным пластом Полацка [15, с. 151–152, мал. 56: 29; 18, с. 41, мал. 90: 1].

З XVI ст. ў культурным пласце паселішчаў пачынае прасочвацца інфільтрацыя керамічнага посуду з палівай, у асноўным, замежнай вытворчасці[5]. Для ўказанага часу назіраецца мінімальная колькасць такога посуду (1–3 % ад сукупнай колькасці), што выступае ў якасці адной з прыкмет указанага перыяда. У XVII ст. доля паліванага керамічнага посуду істотна ўзрастае, аб чым сведчаць некалькі прыкладаў. Так, на Узгорскім замку ў Віцебску, у гарызонце III, які датуецца мяжой XVI–XVII стст., яе колькасць павялічваецца да 13 % [19, с. 37]. У Полацку, у адной з пабудоў, якая датавалася не пазней 30–40-х гг. XVII ст., паліваны посуд складаў толькі 15,2 % [20, с. 127].

Застаецца пад пытаннем храналагічная прывязка да XVI ст. такіх артэфактаў, як люлькі для смалення, якія ў пласце XVII ст. традыцыйна прысутнічаюць.

**IV група.** Чацвёртая група артэфактаў уключае артэфакты, якія маглі прысутнічаць і ў пластах ад XV ст. да XVII ст., і пазней. Сярод артэфактаў дадзенай групы вельмі шмат рэчаў універсальнага гаспадарчага ўжывання без дакладна акрэсленых храналагічных рамак, сярод іх: скабяныя вырабы, шылы і іголкі, нажніцы, ланцугі, прылады для апрацоўкі глебы і збору ўраджая, рыбалоўныя прылады, працоўныя сякеры. Апошняя з груп знаходак для перыяду XV–XVII стст. істотна не змяняецца па форме пасля 60-х гг. XIV ст., калі пачынаюць бытаваць сякеры з прамакутным абухом, што фіксуецца па наўгародскіх матэрыялах [21, с. 163]. Па матэрыялах з тэрыторыі Полацкага Падзвіння нельга пакуль дакладна прасачыць храналагічныя змены у канструкцыі працоўных сякер, менавіта, у XVI ст.

Падобная сітуацыя праяўляецца і адносна нажоў з накладнымі тронкамі. Адным з першых нажоў асаблівай канструкцыі быў экземпляр, выяўлены ў слоі XIV ст. у Лідскім замку [22, с. 128]. Тронкавыя нажы эвалюцыянавалі паступова, і складана аддзяліць тронкавыя нажы XV ст. ад тронкавых нажоў XVI ст. Разам з тым, нягледзячы на шырокія храналагічныя рамкі бытавання ў XVII ст., у іх форме прасочваюцца прыкметы, якія маюць храналагічны характар: звужэнне тронкавай часткі ў параўнанні з лязом ці з'яўленне прафіляванай шыйкі паміж лязом і чаранком [10, с. 268]. Сапраўды, пры параўнанні трон-

[5] У гэтым пытанні трэба ўлічваць сацыяльную стратыфікацыю грамадства і розныя тыпы паселішчаў, бо ў княжацкім ці магнацкім асяродку храналогія інфільтрацыі і яе памеры будуць адрозніваца ад мяшчанскага асяродка.

кавых нажоў з Лучна-1 і Полацка гэта храналагічная рыса добра прасочваецца. На помніку Лучна-1 вышэй указаныя прыкметы выражаны не істотна (Мал. 2: А). Але праводзіць дакладную храналагічную мяжу паміж падтыпамі, ўказанымі вышэй не зусім карэктна, неабходна ўлічваць тып паселішча і маёмасны стан ўладальніка прадмета, бо незаможная шляхта магла мець ва ўжытку простыя па форме прадметы.

Прылады здабывання агню і асвятлення памяшканняў таксама змяняліся вельмі павольна. Для XV–XVII стст. шырокае распаўсюджанне мелі пласцінкавыя крэсівы тыпу V, па класіфікацыі Г. М. Сагановіча [10, с. 271]. Яны добра вядомы па матэрыялах з Полацка, але дакладна храналагічна не прывязаны [1, мал. 90: 3; 23, с. 46; 24, с. 128]. У Лучна–1 падобныя крэсівы прысутнічаюць у запаўненні ям, якія датуюцца першай паловай XVI ст. (Мал. 2: Б, 1). Адносна перапынення бытавання пласцінкавых крэсіваў у XVII ст. нічога дакладна не вядома.

Яшчэ адной храналагічнай праблемай, якая закранае перыяд з XV па XVII стст. з'яўляецца пытанне аб суіснаванні лучнікаў і ражковых падсвечнікаў. Пакуль не ўяўляецца магчымым дакладна сказаць, калі канчаткова ў мяшчанскім асяродку лучнікі цалкам былі зменены ражковымі падсвечнікамі (Мал. 2: Б, 3), бо нельга лічыць лучнікі анахранізмам ў XVI ст. Трэба ўлічваць і сацыяльную стратыфікацыю грамадства, да якога сацыяльнага класа належыў жыхар той або іншай пабудовы. Так, пры даследаваннях старажытнай Дрысы (Верхнядзвінска) у адной з гаспадарчых ям, звязаных з пабудовай, якая датавалася папярэдне часам сярэдзіны – трэцяй чвэрці XVI ст., разам з такімі дарагімі рэчамі як шкляны посуд быў выяўлены трохрогі лучнік[6]. Такія лучнікі былі характэрны і для пласта Полацка або Лучна (Мал. 2: Б, 2), дзе іх храналогія ўключае XVI ст. і нават пазнейшы час [15, с. 157, мал. 54: 20, 22; 61: 4].




*Мал. 2.* Асобныя артэфакты групы IV з помнікаў Лучна–1 (А, Б, Г-1) і Сокал (В, Г-2)

А – тронкавыя нажы; Б – прылады асвятлення і здабывання агню; В – абутковая падкоўка; Г – свінцовыя кулі.

[6] Доследы аўтара 2018 г. знаходзяцца ў апрацоўцы.

Абутковыя падкоўкі могуць маркіраваць перыяд з XV да XVI стст. і пазней. Ранняя храналогія бытавання падковак у Полацку вызначаецца канцом XV–XVI ст. [25, с. 54]. У гэтым сэнсе важным фактам з'яўляецца поўная адсутнасць абутковых падковак на помніку Лучна-1, дзе іх «асяданне ў культурным пласце» яшчэ не адбылося ў дастатковай колькасці, якая б садзейнічала іх выпадковай згубе, а значыць магчыма казаць аб тым, што абутковыя падкоўкі ў першай палове XVI ст. не мелі яшчэ шырокага распаўсюджання сярод шырокіх колаў грамадства. Разам з тым, даследаванне аўтарам месцаў былых фартэцый перыяду Інфлянцкай вайны, Туроўля і Сокал, засведчыла канцэнтрацыю абутковых падковак у месцах прыжывання прадстаўнікоў стралецкага войска (Мал. 2: В). Такія падкоўкі былі характэрны і для XVII ст.

Адносную храналогію і для пласта XV–XVII стст. могуць складаць і замкі тыпу «Ж», якія пачалі ўжывацца з XV ст. паралельна з замкамі тыпу «Е». У XVI ст. яны працягвалі суіснаваць, і па апошніх доследах аўтара на помніках Гарадзішча і Сокал, храналогія якіх звязана з перыядам Інфлянцкай (Лівонскай) вайны, адзначаецца істотная прысутнасць замкоў тыпу «Е», якія як адзначалася раней, пераважаюць і на помніку Лучна–1. Такім чынам, перыяд вайны, па-сутнасці, кансерваваў сітуацыю з развіццём тыпаў рэчаў. Нам дакладна не вядомы час, калі дакладна замкі тыпу «Е» былі зменены замкамі тыпу «Ж», не трэба выключаць, што дадзены працэс падоўжыўся і ў XVII ст, бо менавіта тып ключа «Ж» пераважае на паселішчах Беларусі ў XVII ст. [26, с. 95].

З шэрагу вырабаў з каляровых металаў, якія, па-сутнасці, мелі ўніверсальную храналогію і для перыяду XV–XVII стст., укажам на свінцовыя кулі і шпількі «пус епі». Свінцовыя кулі мелі ў пэўнай ступені ўніверсальную форму, іх храналогію складана распрацаваць, што ўскладняецца малой колькасць помнікаў, дзе яны прывязаны дакладна да пэўнага перыяду. Апошнія даследаванні паселішчаў перыяду Інфлянцкай вайны, Гарадзішча (Туроўля) і Сокал, дазволіла зрабіць такую прывязку да пэўнага храналагічнага адрэзка, не пазней 1579 г. У Лучна–1 адна з куль выяўлена таксама ў пласце пажара, які датуецца часам не пазнейшым за 1551–1552 гг. Фармальны аналіз паміж куляй з Лучна–1 (Мал. 2: Г, 1) з аднаго боку і кулямі з Гарадзішча (Туроўлі) і Сокала (Мал. 2: Г, 2) нічога істотнага не дае.

Шпількі «пус епі», якія выкарыстоўваліся для мацавання жаночай хустачкі, былі вядомыя на шырокай тэрыторыі ў храналагічных межах XIV–XVIII стст. [27, с. 78]. Іх шмат было выяўлена ў Полацку, асабліва, у ювелірнай майстэрні першай паловы XVII ст. [28, с. 7, мал. 11; 29, с. 78–83].

Керамічныя вырабы часткова ў артыкуле ўжо аналізаваліся. З XV ст. і пазней былі характэрны такія новыя па форме пасудзіны як макотры і рынкі, якія існавалі і ў XVII ст., калі іх форма часткова змянілася, што пацвярджаюць і полацкія матэрыялы [15, с. 117–123]. У XVII ст. шырокае распаўсюджанне атрымалі талеркі, у межах Лучна–1 такі від посуду фіксуецца толькі ў выглядзе імпартнага ўзору, з шэрагу, так званай, «каменнай керамікі». Дакладнае з'яўленне такога посуду ў Полацкім Падзвінні не вядома. У табліцы, прысвечанай храналогіі Віцебска бытаванне такой керамікі абазначана ў межах XVI–XVIII стст. [17, с. 46, таб. 3]. У Лучна–1 розныя віды падобнага посуду дакладна фіксуюцца ў ямах, датаваных першай паловай XVI ст. Па прычыне істотнага кошту такі посуд ў побыце захоўвася напрацягу доўгага часу, што было характэрна не толькі для Усходняй, але і для Заходняй Еўропы. Таму для такой групы артэфактаў, як і для манет, важнай уяўляецца дата пачатку бытавання посуду.

Разгледжаная праблема храналагічнай стратыфікацыі XVI ст. па матэрыялах з Полацкага Падзвіння дазваляе зрабіць наступныя высновы.

Агляд артэфактаў па чатырох храналагічных групах засведчыў вельмі малую магчымасць для прывязкі пэўных прадметаў да дакладна датаваных гістарычных падзей у межах XVI ст., таму некаторыя рэчы мелі адносную храналагічную датыроўку. У сувязі з гэтым,

вылучэнне мікраперыядаў у межах XVI ст. носіць праблематычны характар. Такая сітуацыя ўскладняецца малой апублікаванасцю асобных закрытых комплексаў указанага перыяду.

Агляд асаблівасцяў выпадзення манет у межах помніка Лучна–1 указвае на тое, што іх перыяд актыўнага абарачэння і прысутнасць у межах ям не супадаюць, а тлумачацца канкрэтнай сітуацыяй знаходжання пэўнай сумы манет у пабудовах падчас катаклізму, у сувязі з чым пражскія грошы ў мацерыковых ямах маркіравалі ў межах паселішча не XV ст., а пачатак XVI ст., а дэнарыі і паўгрошы Аляксандра Ягелончыка не мяжу XV–XVI стст., а сярэдзіну XVI ст.

Разглядаючы эвалюцыю керамічных гаршкоў у XVI ст., адзначым, што істотныя складанасці існуюць у пытанні размежавання паняццяў «гаршкі канца XV – пачатку XVI ст.», ці гаршкоў «другой паловы XV – першай паловы XVI ст.», у некаторых выпадках такія паняцці змешваюцца і ўтрымліваецца не карэктнае з пункту гледжання храналогіі паняцце «гаршкі XV–XVI стст.». Разам з тым, дакладна магчыма казаць аб пэўных тыпах гаршкоў, якія з'явіліся ў першай палове XVI ст.

Храналагічныя рамкі бытавання некаторых прадметаў (IV група) не дазваляюць іх выкарыстоўваць для храналагічнай ідэнтыфікацыі XVI ст. Гэта праблема ўскладняецца тым, што ў побыце некаторыя артэфакты бытавалі істотны прамежак часу, пазней, чым былі выраблены.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Дук Д. У. Археалагічныя комплексы пасадаў Полацка IX–XVIII стст. (па выніках раскопак 2004–2012 гг.). Наваполацк: ПДУ, 2014.

2. Бохан Ю. М., Скеп'ян А. А. Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя. Мінск: Беларусь, 2011.

3. Гайдуков П. Г., Коньков Ю. П. Славенский клад русских монет конца XV – начала XVI вв. // Всероссийская нумизматическая конференция. Вологда, 1993.

4. Археалагічныя знаходкі з асабістай калекцыі С. Л. Міхейкі: Каталог / укл. Н. Г. Лугіна. Віцебск, 2010.

5. Колчин Б. А. Железообрабатывающее ремесло Новгорода Великого // МИА. 1959. № 65.

6. Бектинеев Ш. И. Денежное обращение на территории Беларуси в IX–XVI веках: нумизмат. исслед. Минск: Беларуская навука, 2014.

7. Рябцевич В. Н. Нумизматика Беларуси. Мінск: Полымя, 1995.

8. Клімаў М. В. Манетныя скарбы XVI ст. з мікрарэгіёна Лучна // МАБ. 2006. Вып. 11.

9. Дук Д. У. Археалагічны комплекс «Пабудова першай паловы XVI ст.» (па выніках раскопак 2001–2002 гг. на Вялікім пасадзе г. Полацка) // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. Полацк, 2003.

10. Археалогія Беларусі: у 4 т. Т. 4. / Пад рэд. В. М. Ляўко і інш. Мінск, 2001.

11. Клімаў М. В. Матэрыялы да рэканструкцыі печаў з посудападобнай кафляй // МАБ. 2003. № 7.

12. Паничева Л. Г. Изразцы и изразцовые печи из позднесредневекового Полоцка // СА. 1981. № 3.

13. Здановіч Н. І., Краўцэвіч А. К., Трусаў А. А. Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка. Мінск: Навука і тэхніка, 1994.

14. Заяц Ю. А. Заславль в эпоху феодализма. Минск: Наука и техника, 1995.

15. Дук Д. У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада. Наваполацк: ПДУ, 2007.

16. Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў: гістарычна-археалагічны нарыс горада ад старажытных часоў да канца XVIII ст. Мінск: Беларус. навука, 2003.

17. Левко О. Н. Витебск. Минск: Беларус. навука, 2010.

18. Клімаў М. В. Справаздача аб археалагічным наглядзе і археалагічных раскопках на аб'екце «Будынак філіяла 3 216 ААТ "АСБ Беларусьбанк"» па вул. Ф. Скарыны ў 2009–2010 гг. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 2768.

19. Левко О. Н. Средневековое гончарство Северо-восточной Белоруссии. Минск: Навука і тэхніка, 1992.

20. Здановіч Н. Комплекс рэчаў з пабудовы XVI ст. з Полацка // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. Полацк, 1998.

21. Колчин Б. А. Хронология новгородских древностей // Новгородский сборник: 50 лет раскопок Новгорода. Москва, 1982.

22. Краўцэвіч А. К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV–XVIII стст.: Планіроўка, культурны слой. Мінск: Навука і тэхніка, 1991.

23. Тарасов С. В. Отчет о раскопках в г. Полоцке в 1986 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 953.

24. Тарасов С. В. Отчет об археологических исследованиях в Полоцке и Полоцкой округе в 1988 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 1084.

25. Магалінскі І. У. Абутковыя падкоўкі XV–XVIII стагоддзяў (па матэрыялах археалагічных даследаванняў у горадзе Полацку ў 2000–2008 гады) // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку). Наваполацк, 2009.

26. Сагановіч Г. М. Кавальска-слясарскія вырабы з раскопак Крэўскага замка // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: новыя матэрыялы і даследаванні. Мінск, 1993.

27. Шаблюк В. У. Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння ў XIV–XVIII стст. Мінск: Беларуская навука, 1996.

28. Дук Д. У. Выратавальныя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Вялікага пасада ў 2005 г. // Вест. Полоцк. гос. ун-та. Сер. А. Гуманит. науки. 2007. № 7.

29. Магалінскі І. У. Шпількі «пус епі» з тэрыторыі Полацка: класіфікацыя, храналогія і праблема паходжання // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплмнарных даследаванняў. Ч. 1. Наваполацк, 2011.